# РЭГУЛЯЦЫЯ ПЫТАННЯЎ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў СТАТУЦЕ 1529 ГОДА

**Л. В. Мікалаева**
*загадчык кафедры гуманітарных дысцыплін*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, г. Мінск, Беларусь*

У артыкуле разглядаюцца пытанні рэгуляцыі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага. Робіцца выснова аб значнай ролі дадзеных аспектаў і прызнанні важнасці іх юрыдычнай фіксацыі, што сведчыла пра ўзрослы ўзровень прававой культуры грамадства.

В статье рассматриваются вопросы регуляции внешней политики Великого Княжества Литовского в Статуте 1529 г. Делается вывод о значительной роли данных аспектов и признании важности их юридической фиксации, что свидетельствовало о возросшем уровне правовой культуры общества.

The article deals with the regulation of foreign policy of the Grand Duchy of Lithuania in the Statute of 1529. A conclusion is drawn is made about the significant role of these aspects and the recognition of the importance of their legal fixation, which indicated an increased level of legal culture of society.

У гісторыі станаўлення прававой культуры на беларускіх землях у перыяд іх уваходжання ў склад ВКЛ (канец XIV – XVI стст.) вылучаецца ў асобны этап у развіцці беларускай дзяржаўнасці. У гэты час назіралася далейшае развіццё заканадаўства і паслядоўны пераход ад звычаёвага да пісанага права. Калі ў XIV ст. усе сферы свецкай дзейнасці яшчэ развіваліся ў значнай ступені па-за межамі пісьменнасці, што абумовіла выразную беднасць дайшоўшых да нас пісьмовых дакументальных, у тым ліку заканадаўчых крыніц, то ў XV ст., а асабліва ў XVI ст. сітуцыя змянілася ў бок павелічэння іх колькасці і відавой разнастайнасці. Разам з тым, менавіта з XIV ст. бярэ свой пачатак практыка стварэння пісаных заканадаўчых дакументаў у форме прывілеяў – заканадаўчых актаў, якімі манархі «давалі або пацвярджалі асаблівыя правы пануючага класа, саслоўя, пэўных сацыяльных або этнічна-рэлігійных груп, асоб» [8, с. 468]. Пры гэтым толькі сярэдзіна XV ст. вызначана навукоўцамі ў якасці прыкладнай мяжы, калі звычаёвае права пачало паступова выцясняцца правам пісаным. Шырокае распаўсюджанне ў гэты час атрымала практыка выдання агульнадзяржаўных прывілеяў ад імя вярхоўнай улады, ліквідаваная толькі з утварэннем Рэчы Паспалітай у 1569 г. Разам з тым, у XV – XVI стст. ішоў працэс стварэння адзінага для ўсёй дзяржавы заканадаўства, пачатак чаму быў пакладзены прывілеямі

XV ст. і Судзебнікам 1468 г. У гэты ж час, з канца XV ст. пачаў канстытуявацца вальны сойм ВКЛ [2, с. 132-149; 3, с. 51; 4, с. 444-449; 9, с. 20], абавязваючыя пастановы якога паступова заваёўвалі месца ў шэрагу заканадаўчых дакументаў. Аднак, як адзначыў Г.Я. Галенчанка, у XVI ст. назіраліся ўжо надзвычай высокія тэмпы агульнадзяржаўнай прававой кадыфікацыі, калі менш чым за 100 гадоў былі паслядоўна распрацаваны і прыняты тры статуты – 1529, 1566 і 1588 гг., якія «па еўрапейскіх тагачасных крытэрыях замацоўвалі агульнадзяржаўную прававую сістэму на вельмі высокім узроўні. Статут 1588 г. афіцыйна аформіў прававы суверэнітэт ВКЛ, фактычна існаванне дзяржаўнай самастойнасці і адасобленасці» [1, с. 81, 82]. У XVI ст. менавіта статуты 1529, 1566 і 1588 гг., як зводы законаў феадальнага права, сталі асноўнымі крыніцамі пісанага права ВКЛ.

Звяртаючыся да зместу першага са Статутаў, прынятага ў 1529 г., трэба адзначыць, што пытанні рэгламентацыі разнастайных аспектаў, якія мелі дачыненне да знешнепалітычнай дзейнасці дзяржавы, занялі ў ім значнае месца. Ужо ў першым раздзеле артыкул другі меў яскравую назву: “О зраженье маестату господарского, а то в том, хто бы до земли неприятелское втек” [7, с. 436]. Месца гэтага артыкула было зусім не выпадковае, паколькі ў пачатку XVI ст. у выніку пераходаў на службу да вялікага князя Маскоўскага Івана III шэрагу памежных князёў ВКЛ страціла каля трэцяй часткі сваёй тэрыторыі. З улікам немагчымасці арышту такіх уцекачоў і прыцягнення іх да асабістай адказнасці, нормы артыкулаў 2 і 3 фіксавалі ў якасці пакарання толькі пазбаўленне такіх асоб годнасці і канфіскацыю на карысць манарха маёмасці такіх збегаў і тых іх сваякоў, якія мелі з імі агульную ўласнасць. Арт. 5 уводзіў жорсткае пакаранне за падробку лістоў і пячатак манарха. Абвінавачанага ў гэтым злачынстве чакала спальванне на вогнішчы [7, с. 436]. Разам з тым арт. 6 р. I Статута 1529 г. замацаваў заканадаўчую абарону годнасці і гарантыю бяспекі дыпламатычных агентаў. Пакаранне за парушэнне гэтага артыкула было жорсткім, бо “…кождый маеть каран быти горлом, так, как бы маестат наш господарский образил” [7, с. 436]. Паколькі манарх з’яўляўся ўвасабленнем дзяржавы, абраза, раненне ці забойства яго пасланніка прыраўнівалася да дзяржаўнай здрады.

У Статуце 1529 г. у цэлым знайшла адбіццё змена знешнепалітычнага становішча ВКЛ у сувязі з цэлым шэрагам войнаў з Вялікім Княствам Маскоўскім у канцы XV – першай чвэрці XVI ст. Значную рэгламентацыю атрымаў р. II “О обороне земской”, робячы акцэнт не толькі на яе арганізацыі, але і на санкцыях за парушэнне шляхтай свайго ваеннага абавязку. Арт. 1 уводзіў на 10 гадоў ваенную

ўставу, якая рэгламентавала парадак нясення ваеннай службы. Землеўладальнікі ў адпаведнасці з земскай ухвалай, якая ўказвала прапорцыю выстаўляемых ваеннаабавязаных мужчын, павінны былі з'яўляцца ў прызначанае месца збору на пэўны час. Заможныя шляхцічы павінны былі ўзброіць сваіх людзей належным чынам і выпраўляць "пахолка на добром кони, штобы конь стоял за чотыри копы грошей, а на нем бы панцэр, прилбица а корд, павезка а древце з прапорцом". Незаможныя шляхцічы і мяшчане павінны былі служыць самі і ўзбройвацца адпаведна сваім магчымасцям. Асобам, якія ўхіляліся ад ваеннай службы, спазняліся на месца збору паспалітага рушання, ці пакідалі яго без дазволу гетмана, пагражала пазбаўленне маёнткаў [7, с. 439]. Арт. 2 патрабаваў, каб шляхцічы ў войску станавіліся пад харугвы свайго павета, калі не будзе іншага загаду гетмана. Калі іх маёнткі знаходзіліся ў розных паветах, перавага аддавалася харугве таго павета, дзе знаходзіліся галоўныя маёнткі. Падданыя князёў і магнатаў павінны былі станавіцца ў харугвы тых паветаў, дзе трымалі маёнткі атрыманыя ад манарха. У адваротным выпадку ім пагражала канфіскацыя такіх маёнткаў [7, с. 439-440]. Духоўныя асобы, якія мелі ў трыманні земскія маёнткі, таксама павінны былі несці з іх ваенную службу: з купленых – служыць асабіста, з атрыманых у спадчыну – выпраўляць неабходную колькасць ваяроў (арт. 3) [7, с. 440]. Вызваліць ад нясення ваеннай службы магла толькі хвароба, што трэба было пацвердзіць (арт. 5) [7, с. 440]. Але калі ў хворага быў сын, якому было больш за 17 гадоў, то са згоды гетмана сын мог замяніць бацьку. Юнакі з 17 гадоў павінны былі выязджаць на попіс разам з бацькам, і гетман потым вырашаў, ці гатовыя яны да ваеннай службы (арт. 6) [7, с. 440]. Кожны, хто без дазволу гетмана ад'язджаў з войска, страчваў маёнткі (арт. 11) [7, с. 440]. Тыя шляхцічы, хто падчас ваенных дзеянняў, знаходзячыся ў войску, грабілі маемасць іншых землеўласнікаў, павінны былі кампенсаваць награбленае. За забойствы пагражала смяротнае пакаранне (арт. 15) [7, с. 441].

Важныя аспекты, меўшыя дачыненне да сферы знешняй палітыкі былі зафіксаваны і ў раздзеле III "О слободах шляхты и о розмножени Великого Князьства". Услед за адпаведнымі артыкуламі агульназемскіх прывілеяў 1447 і 1492 гг. арт. 2 р. III Статута ВКЛ 1529 г. утрымліваў абавязацельства манарха захаваць тэрытарыяльную цэласнасць дзяржавы: "Господар шлюбуеть розмножати Великое Князьство Литовское и, што не добре розобрано, ку панству привернути. Тэж добра Князьства того Великого Литовского не вменшим, але што будеть несправедливо отдалено и неслушне розобрано и упрохано, ку властности того Князьства приведем и привести хочем" [7, с. 441]. Арт.

3 р. III казаў пра забарону раздаваць іншаземцам маёнткі і пасады ў ВКЛ [7, с. 441]. Такім чынам, кіраўніцтва ВКЛ юрыдычна не магло саступаць хаця б частку тэрыторыі дзяржавы. Наступствам гэтага было тое, што ў будучых войнах з Вялікім Княствам Маскоўскім ВКЛ звычайна заключала перамір'і, якія давалі надзею на магчымасць вяртання страт ў будучым. У сваю чаргу, артыкул 3 бараніў палітычную эліту ВКЛ ад замежных канкурэнтаў, гарантуючы манапольныя правы мясцовых шляхцічаў на пасады і зямельную ўласнасць сваёй дзяржаве. Разам з тым арт. 8 р. III даваў дазвол "…абы княжата и панове хоруговные, шляхта и бояре пречоные мели волную моц выйти с тех земль наших Великого Князьства и иных для набытья лепшого щастья своего и навченя вчинков рыцэрских до всяких земль чужих, кром неприятелей наших…" [7, с. 441-442]. Аднак пры гэтым земская служба з маёнткаў такіх падарожнікаў павінна была выконвацца.

Пэўнае дачыненне да сферы знешняй палітыкі меў і арт. 9 р. IV "О поглаве женской и о выправу девок". Назва артыкула змяшчала сутнасць праблемы, якая актуалізавалася да моманту выдання Статута 1529 г.: "О девки, которые будуть выдаваны до чужое земли". На той момант пачасціліся выпадкі дынастычных шлюбаў паміж магнатамі ВКЛ, Польшчы і Мазовіі, часам і іншых краін, што пагражала з'яўленнем на тэрыторыі ВКЛ землеўладальнікаў замежнага паходжання, якія маглі атрымаць маёнткі ў якасці пасагаў сваіх жонак. Арт. 9 унармаваў гэту праблему. Сваякам дзяўчыны, якая выходзіла замуж за мяжу прадпісвалася кампенсаваць яе пасаг грашыма [7, с. 444]. Такім чынам, зямельная ўласнасць не магла фігураваць у якасці пасагу пры заключэнні шлюбаў літвінскіх шляхцянак з замежнымі падданымі.

У р. VIII "О права земленые, о границах и о межах, о копах" рэгуляванню падлягалі менавіта ўнутрыдзяржаўныя пазямельныя справы [7, с. 455-458]. Аднак матэрыялы Кнігі № 560 Метрыкі ВКЛ [5, с. 51-84] наводзяць на думку, што механізм усталявання межаў прыватных зямельных уладанняў, апісаны ў Статуце 1529 г., мог выкарыстоўвацца і падчас дэмаркацыі і дэлімітацыі дзяржаўных межаў ВКЛ з суседнімі краінамі. Па меншай меры, захаваўшыяся звесткі дазваляюць сцвярджаць, што пры размежаванні ВКЛ з дзяржавай Лівонскага Ордэна ў 1541 і 1542 гг. ён выкарыстоўваўся [6, с. 18-20].

Такім чынам, асноўныя аспекты знешняй палітыкі ВКЛ знайшлі сваё адбіццё ў Статуце 1529 г., заняўшы ў ім істотнае месца. У сваю чаргу гэта было сведчаннем усведамлення іх важнасці для ўсёй сферы кіравання дзяржавай і ўзросшай прававой культуры тагачаснага грамадства.

# БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Галенчанка Г.Я. Развіццё культуры Беларусі // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Мінск: БелЭн, 2000. 432 с.: іл. С. 81, 82.

2. Любавский М.К. Литовско-русский сейм: Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешнею жизнью государства / М.К. Любавский. М.: Изд-во Имп. О-ва Ист. и Древн. Рос. при Моск. ун-те, 1900. 850, 232 с.

3. Максимейко Н.А. Сеймы Литовско-Русского государства до Люблинской унии 1569 г. Харьков: Тип. А. Дарре, 1902. II, 164 с., IV, 205 с.

4. Малиновский И.А. Рада Великого Княжества Литовского в связи с Боярской думой древней России. Томск: Типолитография Сибирск. Т-ва Печатн. Дела, 1912. Ч. 2, вып. 2: Рада Великого Княжества Литовского (1492-1569). 492, XVIII, XXXV с.

5. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 560 (1541 – 1542 гг.). Кніга перапісаў № 3/ Падрыхтоўка тэксту да друку і навуковы апарат: Алег. І. Дзярновіч. 2-е выд. Мінск: ATHENAEUM, 2010. 268 с.: іл. 6. (Калекцыя “Помнікі, Том II”).

6. Мікалаева Л.В. Кніга Метрыкі ВКЛ № 560 як крыніца па гісторыі літвінска-лівонскіх адносін у канцы XV – першай палове XVI ст. / Л.В. Мікалаева// Белорусская государственность: истоки, становление, развитие (IX – XXI вв.): материалы Республиканской научно-теоретической конференции, Минск, 29 июня 2017 г./ редкол.: А.В. Касович (отв. ред.) [и др.]. Минск: РИВШ, 2017. С. 18 – 20.

7. Статут Вялікага Княства Літоўскага 1529 г. // Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. Мінск: БелЭн, 2010. Т. 3. Дадатак. А – Я/ Рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. С. 436 – 467.

8. Юхо Я. Прывілеі // Вялікае Княства Літоўскае: энцыклапедыя. У 2 т. Мінск: БелЭн, 2006. Т. 2. Кадэцкі корпус – Яцкевіч/ Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; Маст. З.Э. Герасімовіч. С. 468.

9. Błaszczyk G. Litwa na przełome średniowiecza i nowozytności: 1492–1569/ G. Błaszczyk. Poznań: Wydawnictwo Poznańskie, 2002. 336 s.